■ Спорт-тайм

# КАНТРОЛЬНЫ СТАРТ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» падводзім вынікі выступлення нашых атлетаў на чэмпіянаце Еўропы, расказваем пра медалі мастацкіх гімнастак на Кубку свету і бліскучае выступленне скакуноў на батуце.**

***1. У Амстэрдаме завяршыўся чэмпіянат Еўропы па лёгкай атлетыцы.*** Зборная Беларусі ў выніковым медальным заліку размясцілася на 12-м месцы. У скарбонцы нашай каманды тры медалі: «золата» ў кіданні кап'я заваявала Таццяна Халадовіч, Аліна Талай прынесла «серабро» ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі, а Іван Ціхан — у кіданні молата.

— *Разумею, што паказала сур'ёзны вынік. Вельмі рада! Хоць сваёй пераможнай спробай не задаволена. Адчуваю, што магу больш. Наперадзе Алімпійскія гульні. Не будзем нічога загадваць, будзем працаваць,* — адзначыла пасля выступлення ў Амстэрдаме Таццяна Халадовіч.

Нягледзячы на ўзнагароды, не вельмі задаволеным сваім выступленнем засталіся і іншыя медалісты нашай зборнай.

— *Вынік атрымаўся сярэдні, магло б быць і лепш, хацелася скласці канкурэнцыю Паўлу Файдэку. У першых пяці спробах імкнуўся аптымізаваць рух, быў пераломны момант. Трохі не атрымалася, хацелася больш выразна-сці,* — пракаментаваў Іван Ціхан.

Першае месца ў медальным заліку заняла зборная Польшчы, другімі сталі атлеты з Германіі, тройку лідараў замкнула каманда Вялікабрытаніі.

***2. Чатыры медалі выйгралі беларускія грацыі на этапе Кубка свету па мастацкай гімнастыцы.*** Тры з іх на рахунку лідара зборнай Меліты Станюты. Пасля пятага месца ў індывідуальным мнагаборстве ў першы дзень спаборніцтваў у асобных відах спартсменка здолела падняцца на п'едэстал у практыкаванні з мячом (бронза), кампазіцыі з булавамі (бронза) і ў выступленні са стужкай (серабро).

У групавых практыкаваннях (у складзе Ксеніі Чалдышкінай, Ганны Дудзянковай, Марыі Кадобінай, Валерыі Пішчэлінай і Арыны Цыцылінай) дзяўчаты сталі сярэбранымі прызёркамі ў мнагаборстве.

***3. Маладзёжная зборная Беларусі (U-20) па валейболе выйшла ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы-2016.*** У кваліфікацыйным турніры, які праішоў у мінскім Палацы спорту, нашы валейбалісты саступілі чэхам, перамаглі датчан і славакаў. Такі вынік дазволіў падапечным Уладзіміра Майсеівіча заняць другое месца ў групе і адабрацца на першынства кантынента.

Фінальная частка турніру пройдзе ў Балгарыі 2-10 верасня 2016 года. Зборная Беларусі на групавым этапе сустрэнецца з камандамі Італіі, Расіі, Сербіі і Турцыі.

***4. У Партугаліі завяршыўся апошні ў гэтым сезоне і перад Алімпіядай у Рыа-дэ-Жанейра этап Кубка свету па скачках на батуце.*** Нашы спартсмены заваявалі там тры залатыя і два сярэбраныя медалі.

У індывідуальных скачках, якія з'яўляюцца алімпійскай дысцыплінай, Уладзіслаў Ганчароў і Тацццяна Пятрэня падняліся на найвышэйшую прыступку п'едэстала, Ганна Гарчанок заняла другое месца.

У сінхронных скачках наш жаночы дуэт (Тацццяна Пятрэня/Ганна Гарчанок) паказаў найлепшы вынік турніру і заваяваў залатыя медалі. Мужчынскі (Уладзіслаў Ганчароў і Алег Рабцаў) заваяваў сярэбраныя ўзнагароды.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# ЯНЫ НАПІСАЛІ ГІСТОРЫЮ

## ПАРТУГАЛІЯ — ЧЭМПІЁН ЕЎРОПЫ-2016



**Упершыню ў вырашальным паядынку Euro каманды не забілі ніводнага гола ў асноўны час. Аўтарам адзінага мяча стаў Эдэр, які далёкім ударам на 109-й хвіліне пацэліў у вароты французаў. Гэта быў «залаты» гол партугальскага нападаючага, за рэшту часу гаспадары турніру так і не змаглі дагнаць сапернікаў. Такім чынам, зборная Партугаліі ўпершыню ў гісторыі стала пераможцай чэмпіянату Еўропы.**

А на самым старце паядынку на полі Стад-дэ-Франс разыгралася сапраўдная драма. На 8-й хвіліне сустрэчы ў выніку сутыкнення з нападаючым французаў Дзімітры Паетам траўму калена атрымаў капітан партугальцаў Крышціяну Раналду. На дапамогу футбалісту паспяшаліся медыкі і яшчэ дзесятак хвілін спрабавалі вярнуць «зорку» на поле, але так і не змаглі гэтага зрабіць. Са слязамі на вачах на 25-й хвіліне на насілках Раналду пакінуў газон. Яму на замену выйшаў Рыкарду Куарэжму.

— *Мы прысвячаем перамогу Крышціяну, біліся дзеля яго. Ён наш лідар, наш капітан, легенда Партугаліі. Зразумела, для нас яго траўма стала шокам. Раналду — бліскучы гулец, найлепшы атакуючы футбаліст планеты. Ён можа зрабіць гол у любы момант з нічога. Вядома, мы звязвалі з ім нашы надзеі ў атацы. Але Партугалія — гэта не толькі Крышціяну. Што мы сёння і даказалі,* — сказаў пасля гульні партугальскі абаронца Пепе.

Сам Раналду пасля перамогі яго каманды, здаецца, трохі забыўся пра сваю траўму і быў неверагодна шчаслівы.

— *Я чакаў гэтага шанцу з 2004 года. Лічу, што мы заслужылі поспех усёй Партугаліяй. Гэта адзін з самых фантастычных момантаў у кар'еры. Я заўсёды казаў, што хачу нешта выйграць для сваёй краіны, і вось гэты момант надышоў. На жаль, я пакінуў поле вельмі рана праз траўму, але я заставаўся разам з камандай і працягваў верыць у нашу перамогу,* — адзначыў футбаліст.

Нагадаем, што каманда Фернанду Сантуша заваявала тытул, атрымаўшы на турніры толькі адну перамогу ў асноўны час — у паўфінале над Уэльсам (2:0). Таму не дзіўна, што фаварытамі сустрэчы спецыялісты ўсё ж называлі французаў.

— *Мы прапусцілі ўнікальную магчымасць выйграць Еўра дома. Адчуваю велізарнае расчараванне, у мяне проста няма слоў. Спатрэбіцца час, каб перажыць гэта. Мы перамагалі і прайгравалі разам. Было б вельмі добра прынесці трафей французам, але мы не зрабілі гэтага,* — пракаментаваў паражэнне **галоўны трэнер зборнай Францыі Дыд'е Дэшам.**

Адзначым, што на турніры партугальцы вызначыліся шэрагам індывідуальных рэкордаў. Крышціяну Раналду стаў першым па колькасці матчаў у фінальных турнірах. На яго рахунку 21 гульня, што на гэты больш, чым у француза Ліліяна Цюрама і галандца Эдвіна ван дэр Сара. Таксама нападаючы стаў першым гульцом, які забіў у фінальных стадыях чатырох чэмпіянатаў Еўропы. Іншы партугалец, Саншэш, стаў самым юным удзельнікам фіналаў чэмпіянату Еўропы, ён выйшаў на поле ва ўзросце 18 гадоў і 327 дзён і стаў самым маладым уладальнікам тытула чэмпіёна Еўропы ў гісторыі. Ну а найлепшым бамбардзірам Еўра-2016 стаў нападаючы зборнай Францыі Антуан Грызман.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

**12 ЛІПЕНЯ**

**1916** год. У горадзе Горкі Магілёўскай вобласці нарадзіўся Лаўрэнцій Сямёнавіч Абэцэдарскі, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АПН СССР. У 1946 годзе скончыў БДУ, выкладаў у ім. Вывучаў расійска-беларускія адносіны ў 2-й палове XVI — XVII стагоддзяў, Нацыянальна-вызваленчую і антыфеадальную барацьбу ў Беларусі ў XVII стагоддзі. Сабраў багаты матэрыял аб перасяленні беларусаў у Маскву і Замаскварэцкі край у 2-й палове XVII стагоддзя. Адзін з аўтараў «Гісторыі БССР», «Гісторыі Беларускай ССР». Памёр у 1975 годзе.

**1941** год. На подступах да Магілёва адбылася адна з самых кровапралітных бітваў з гітлераўскімі захопнікамі. 23 дні і ночы абаранялі горад воіны 172-й стралковай дывізіі, работнікі міліцыі і тысячы апалчэнцаў. Увечары 12 ліпеня пасля жорсткага бою, калі на Буйніцкім полі засталося гарэць 39 фашысцкіх танкаў, на пярэднім краі абароны пабываў ваенны карэспандэнт Канстанцін Сіманаў. Тут ён сустрэўся з воінамі-абаронцамі, якія вызначыліся ў гэтым баі, з камандзірам палка Сямёнам Куцепавым, які, па прызнанні самога пісьменніка, шмат у чым паслужыў праабразам генерала Серпіліна. Пра герояў бітвы ён распавёў у



нарысе «Гарачы дзень», апублікаваным у газеце «Известия» 20 ліпеня. Пазней характары і лёсы абаронцаў Магілёва паслужылі прататыпамі герояў раманаў «Жывыя і мёртвыя», «Салдатамі не нараджаюцца».

**1946** год. Нарадзілася Валянціна Васільеўна Талкунова, расійская эстрадная спявачка, народная артыстка Расіі. Першая выканаўца прысвечаных ёй песень і вакальных цыклаў, монаоперы «Руская жанчыны» І. Катаева на вершы М. Някрасава. У рэпертуары былі рускія народныя песні. Лаўрэат 1-й прэміі Усесаюзнага тэлеконкурсу «З песняй па жыцці».

Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік:**
*«Лепей за ўсё смяяцца з сябе. Ніхто не крыўдуе».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.53 | 21.36 | 16.43 |
| Віцебск — | 4.35 | 21.34 | 16.59 |
| Магілёў — | 4.43 | 21.27 | 16.44 |
| Гомель — | 4.49 | 21.14 | 16.25 |
| Гродна — | 5.10 | 21.50 | 16.40 |
| Брэст — | 5.20 | 21.42 | 16.22 |

## Месяц

***Першая квадра 12.07—19.07. Месяц у сузор'і Скарпіёна.***

## Імяніны

***Пр.*** *Рыгора, Пятра, Паўла.*
***К.*** *Веранікі, Веры, Яніны, Андрэя, Васіля, Яна.*

# ЗАЎТРА






Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

УСМІХНЕМСЯ

**Бабуля, якая навучылася карыстацца інтэрнэтам, учыніла скандал у электроннай чарзе да тэрапеўта.**

Пераможца конкурсу «Міс Свету» вырашыла даказаць усім, што прыгожая — не значыць дурная.

— Я разбуру гэты стэрэафон, — заявіла яна.

**Вегетарыянцы — гэта такія дзіўныя людзі, якія думаюць, што каўбаса зроблена з мяса.**

— Ганна, а твой Міхась табе па гаспадарцы дапамагае?

— Мой Міхась з катэгорыі такіх людзей, якія найбольшую карысць прыносяць, калі нічога не робяць.

**Паўднёвы курорт, багаты прылавак з садавінай пасярод вуліцы. Сонная прадаўшчыца адганяе мух. З другога боку прылаўка стаіць пакупнік (мяркуючы па сонечных апёках, другі дзень на адпачынку) і ўважліва вывучае цэннікі. Пасля чаго адзначае:**

**— Вы ведаеце, я з Сібіры. У нас усё гэта (шырокі жэст рукой) не расце. Але ўсё таннейшае.**




Малюнак Алега ПАПОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2782.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 ліпеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12